УДК 398.3 (=161.3)

# ТЫПЫ «ЗНАЮЧЫХ» У БЕЛАРУСКІМ ПАЛЕССІ І ІХ ЗМЕНЫ Ў ХХ – ПАЧАТКУ ХХІ СТ.

***У.А. ГАНЧАР***
*Беларускі дзяржаўны ўніверсітэт,*
*г. Мінск, Рэспубліка Беларусь*

Звесткі аб знахарстве на тэрыторыі Беларускага Палесся ў навуковых працах сустракаецца з канца ХІХ – пачатку ХХ ст., калі пачынаецца этнаграфічнае вывучэнне дадзенага рэгіёна. Пры гэтым даследчыкі сутыкнуліся з неаднароднасцю носьбітаў знахарскіх ведаў. Да таго ў народнай традыцыі яны фіксаваліся пад рознымі назвамі. Паўстала пытанне класіфікацыі розных тыпаў «*знаючых*». Дадзеная праблема ў беларускай этналагічнай навуцы не вырашана канчаткова да нашага часу.

Мэта артыкула – выявіць тыпы «*знаючых*» людзей у традыцыйным знахарстве Беларускага Палесся і прасачыць іх змены ў ХХ – пачатку ХХІ ст.. Пад тэрмінам «*знаючыя*» ў артыкуле разумеюцца розныя тыпы носьбітаў знахарскіх ведаў. Аўтар разглядае знахарства як сістэму ўяўленняў і ведаў, якая грунтуецца на характэрным для традыцыйнай культуры беларусаў светапоглядзе і накіраваная на ўзаемадзеянне з соцыумам і культурнай прасторай шляхам магічнага ўздзеяння.

Пры аналізе папярэдніх даследаванняў на дадзеную тэму, якія тычацца знахарства як Беларускага Палесся, так і іншых усходнеславянскіх рэгіёнаў, можна выдзеліць два падыходы да праблемы тыпалагізацыі «*знаючых*». Першы з іх за аснову бярэ характар знахарскіх ведаў і накіраванасць магічнай практыкі «*знаючых*» і заключаецца ў падзеле носьбітаў знахарскіх ведаў на «знахара», які з дапамогай Бога дзейнічае на карысць людзям, і «чараўніка», крыніцай магічнай сілы якога з'яўляецца нячыстая сіла і дзейнасць якога мае адмоўны накірунак [1; 2, с. 547]. З іншага боку, услед за Е.Р. Раманавым сустракаецца падзел «*знаючых*» на «ведзьмакоў навучоных» і « прыродных ведзьмакоў» [3, с. 7; 4, с. 10]. Аднак дадзеныя падыходы не пазбаўлены пэўных недахопаў. Так, падзел «*знаючых*» на «ведзьмакоў навучоных» і «прыродных ведзьмакоў» сярод даследчыкаў канца ХІХ – пачатку ХХ ст. сустракаецца толькі ў Е.Р. Раманава прымяняльна да тэрыторыі Беларускага Падняпроўя. Пры гэтым у іншых працах па этнаграфіі не толькі Беларускага Палесся, але і іншых гісторыка-культурных рэгіёнаў этнічнай тэрыторыі беларусаў канца ХІХ – пачатку ХХ ст. дадзеная класіфікацыя не выкарыстоўваецца. Не зафіксаваная яна і ў пазнейшых публікацыях палявых матэрыялаў, а таксама пры палявых даследаваннях аўтара. Вераванні аб набыцці знахарскіх ведаў яшчэ да нараджэння сустракаюцца у беларусаў, аднак яны не выступаюць у якасці асноўнага крэтэрыя тыпалагізацыі «*знаючых*» ў традыцыйнай культуры беларусаў увогуле і Беларускага Палесся ў прыватнасці.

Падзел носьбітаў знахарскіх ведаў на «знахара» і «чараўніка» таксама не ў поўнай меры адлюстроўвае ўяўленні насельніцтва Беларускага Палесся. Прычыны гэтага з'яўляюцца наступнымі. Дадзеная класіфікацыя з'явілася ў ХІХ ст., калі даследчыкі традыцыйнай культуры ўсходнеславянскіх народаў звярнулі сваю ўвагу на знахарства. Сярод розных варыянтаў класіфікацыя з раздзяленнем «*знаючых*» на чараўніка і знахара хутка стала распаўсюджанай і захоўвае дадзеныя пазіцыі да нашага часу.

Аднак, на думку аўтара, пры дадзеным падыходзе даследчыкамі ігнаруюцца тры акалічнасці. Па-першае, гэта перанос ўяўленняў, характэрных для адной культурнай традыцыі, у прыватнасці з Заходнееўрапейскай, на другую культурную традцыю – усходнеславянскую (пры гэтым улічваючы ўсе асаблівасці этнакультурных працэсаў у розных усходнеславянскіх народаў). У прыватнасці, гэта тычыцца дуалістычных прадстаўленняў аб «чорнай» і «белай» магіі і адпаведны падзел носьбітаў магічных ведаў, што відавочна паўплывала на супрацьпастаўленне знахара і чараўніка ў навуковай літаратуры. Як адзначае В.Ф. Райан, «да ХІХ ст. прыняты на Захадзе падзел на «чорную» і «белую» магію ўспрынялі адукаваныя, як, верагодна, і неадукаваныя, рускія» [5, с. 112]. Дадзены тэзіс асабліва характэрны для адукаваных слаёў грамадства, да якіх належылі і даследчыкі традыцыйнай культуры ўсходніх славян. Між тым асноўная маса насельніцтва, сялянства, успрыняла дадзенае дзяленне значна пазней. У прыватнасці, палявыя даследаванні аўтара паказваюць, што ўяўленні аб веры ў «чорную» і «белую» магію з'яўляюцца на тэрыторыі Беларускага Палесся ў два-тры апошніх дзесяцігоддзя, у значнай ступені пад уплывам СМІ і тэлебачання.

ПолесГУ

Па-другое, пры выкарыстанні дадзенага падыходу ігнаруюцца этнічныя традыцыі розных усходнеславянскіх народаў, а таксама мясцовыя лакальныя асаблівасці. Вынікам гэтага з'яўляецца перанос назваў з адной этнічнай традыцыі на другую, што выклікае некарэктную інтэрпрэтацыю этнаграфічных матэрыялаў. Асабліва гэта датычыцца назвы «знахар», якая ў розных дыялектных варыянтах распаўсюджана сярод усіх усходнеславянскіх народаў, пры гэтым абазначаючы розныя тыпы носьбітаў знахарскіх ведаў. У навуковую літаратуру дадзенае слова ўвайшло ў значэнні, якое яно мела сярод рускіх цэнтральных рэгіёнаў: «чараўнікі дзейнічаюць з дапамогай дзьявальскай сілы, знахары ж – гэта «знаткі», знаючыя людзі, і роля іх, у пераважнай большасці выпадкаў, чыста лячэбная» [6, с. 311]. Аднак у многіх іншых этнічных і лакальных традыцыях, у прыватнасці на тэрыторыі Беларускага Палесся, слова «*знахар*» мела (і мае) іншае значэнне. Ігнараванне рэгіянальных і лакальных адрозненняў уносіць дадатковую блытаніну. Так, ва ўводзінах да апублікаванага ў канцы 2010 г. першага тома выдання «Народная демонология Полесья», які прысвечаны менавіта носьбітам знахарскіх ведаў дадзенага рэгёна, Л.М. Вінаградава, А.Я. Леўкіеўская адзначаюць «Тэрміналагічна яны («*знаючыя*» – аўт.) цяжка адрозніваюцца: у адных сёлах словы «знахар» і «чараўнік» – поўныя сінонімы, а ў іншых яны супрацьлеглыя па прызнаку «дрэнны/добры». «Знахор – тот же колдун, знахор – это коб шчо плохэе сделать» (Ласіцк брэсц.) ці: «Знахурка, ведьма, каўдунка – плохіе, шаптуха – хорошая» (Тонеж гомел.)» [7, с. 31]. Прыводзячы дадзеныя прыклады, даследчыцы зыходзяць з прынятага ў расійскай этнаграфічнай навуцы вызначэння слова «знахар», разглядаючы назву «*шаптуха*» як адзін з мясцовых варыянтаў. Між тым на тэрыторыі Беларускага Палесся назвы «*знахар*» і «*шаптун*» не з'яўляюцца сінонімамі і абазначаюць розныя тыпы носьбітаў знахарскіх ведаў.

Трэцім момантам з'яўляецца выкарыстанне даследчыкамі палявых матэрыялаў апошніх дзесяцігоддзяў для класіфікацыі «*знаючых*» у народнай традыцыі канца XIX – пачатку XX ст., пры гэтым зыходзячы з пазіцый статычнасці знахарства на працягу XX ст. Аднак даступныя матэрыялы сведчаць аб значных зменах у знахарстве на працягу XX ст., у тым ліку тыпалогіі носьбітаў знахарскіх ведаў, іх успрыняцці насельніцтвам. Выкарыстанне ж сучасных палявых матэрыялаў па дадзенаму пытанню як ідэнтычных матэрыялам стогадовай даўніны без крытычнага іх успрыняцця ўносіць дадатковую блытаніну (падрабязней аб гэтым ніжэй).

Адзначыўшы дадзеныя моманты, можна перайсці да разгляду непасрэдна тыпаў «*знаючых*» на тэрыторыі Беларускага Палесся. На дадзенай тэрыторыі ў перыяд XX – пачатку XXI ст. зафіксавана даволі вялікая колькасць назваў, якія абазначалі носьбітаў знахарскіх ведаў [8, с. 78-81; Карта-схема 5; 9, с. 106-110]. Трэба адзначыць, што валоданне пэўнымі людзьмі магічнымі ведамі часта абазначалася найбольш агульнай характарыстыкай у выглядзе выраза «*той, хто знае*» («*тая, хто знае*»). Ці, напрыклад, калі характар і ступень валодання знахарскімі ведамі былі вядомыя, маглі ўдакладніць: «*той знаў усё*». Калі ж дадзеныя параметры не былі дакладна вядомымі, выказвалася меркаванне: «*ён, мабыць, нешта знае*». Побач з дадзенымі абазначэннямі выкарыстоўваліся назвы, якія характарызавалі пэўныя тыпы носьбітаў знахарскіх ведаў ці ўжываліся для ўдакладнення пэўных функцый «*знаючых*».

Прааналізаваўшы матэрыялы на тэрыторыі Беларускага Палесся, можна выдзеліць два асноўныя тыпы «*знаючых*»: «*шаптун*» ( ж. «*шаптуха*») і «*знахар*» (ж. «*знахарка*»). «*Шаптунамі*» на тэрыторыі Беларускага Палесся называлі «*знаючых*», магічная сіла якіх паходзіла, на думку насельніцтва, ад Бога. Іх асноўный функцыяй з'яўлялася папярэджанне і лячэнне хвароб людзей і жывёлы, якія мелі натуральныя прычыны ці з'яўляліся вынікам ненаўмыснага чаравання і іншага звышнатуральнага ўздзеяння падобнага роду ( напрыклад, бытавыя траўмы, супыненне крыві, зубны боль, скула, рожа, урокі, спуг). Напрыклад, А.К. Сержпутоўскі прыводзіць наступныя словы аднаго са сваіх інфармантаў: «У нас у кожнай вёсцы знайдзецца такая баба, каторая хутко ўмее атхадзіць ат урокаў ці падзіву, бо тут не трэз знацца з нечысцю, а толькі ведаць, якія прымхі проціў чаго намагаюць да якія шэпты трэз калі шаптаць. А бабы на гэтае вельмі здолны» [10, с. 224]. У некаторых выпадках у якасці іх функцый адзначаюцца таксама варажба, якая, аднак, не патрабавала непасрэднага кантакту з нячыстай сілай і заключалася ў тлумачэнні сноў, а таксама прадказаннях на аснове назіранняў за з'явамі акружаючай прыроды, паводзінамі жывёл, зменаў якасцей пэўных прадметаў і г.д. Напрыклад, адна з апытаных намі «*шаптух*» з Іванаўскага раёна расказала, што пры яе родах «*шаптуха*», якая выконвала функцыі павітухі, прадказала яе лёс па зорах: «*А тоды бабушка заўяжа вона пупа, выйдуць, як зырно, чы так. Вона подывыцца, і говорыць, вот хоця бы моей мамы: «Вот, – говорыць, – Насця, ў тэбэ гэта дэвочка будэ годоватыса, вона, – говорыць, – будэ помочная, вона будэ помогаць Богу, потому шо вона ўрождёна ў тэбэ такая*» [К.Ф.М.].



Полесгу

Здольнасць дадзенага тыпу носьбітаў знахарскіх ведаў выконваць свае функцыі трактавалася насельніцтвам як наяўнасць звышнатуральных здольнасцей, а менавіта «*божы дар*». «*Божы дар*» як азначэнне асаблівых здольнасцей дадзенага тыпу «*знаючых*» выражаўся ў эфектыўнасці іх практыкі і асаблівых здольнасцях да запамінання знахарскіх ведаў, перш за ўсё ў выглядзе замоўных тэкстаў, што, у сваю чаргу, з'яўлялася своеасаблівай санкцыяй звышнатуральных сіл, перш за ўсё Бога, на знахарскую дзейнасць: «*Дар божы. Бог. От мы сядзелі, у нас тут дзед памер. От мы сядзелі і бабушка адна ўсё расказувала, як глаза ўгаварываць і ўсё: і балячку, і скулу. Усе сядзелі, так, і ніхто не поняў. Адна я ўсё сразу паняла. От глаза ўгаварываць. Потом скулу она эта во шаптала, і я поняла. Это трэба шоб Господзь даў дар божы такі, шоб ты понімаў*» [С.Е.П.]. Каб атрымаць дадзеныя здольнасці, згодна з народнымі ўяўленнямі, неабходна было весьці прыстойны лад жыцця, хаця пэўныя людзі, на думку носьбітаў традыцыйнай культуры, мелі схільнасць да гэтага. Гэта тычылася тых, хто быў першым і апошнім дзіцём у сваёй сям'і: «кажуць, што найлепш памагае такі знахар, які быў першы або апошні у бацькоў» [11, с. 103]. Аднак наяўнасць такіх схільнасцей не гарантавала іх уладару валоданне магічнымі ведамі, якія было неабходна атрымаць.

Іншыя назвы дадзенага тыпу «*знаючых*», якія бытавалі на тэрыторыі Беларускага Палесся, традыцыйна адлюстроўвалі пэўныя полаўзроставыя характарыстыкі і фукцыянальную спецыялізацыю. Да агульнараспаўсюджаных назваў, якія адлюстроўваюць полаўзроставыя асаблівасці, адносяцца назвы «*дзед*» (ж. «*баба*»). Пераважная большасць «*шаптуноў*» з'яўлялася людзьмі сталага ўзросту, асабліва гэта тычылася жанчын, якія складалі пераважную большасць сярод дадзенага тыпу носьбітаў знахарскіх ведаў: «Пры хворасьці дзяцей перш за ўсё зварачаюцца да «баб» (шаптух)» [12, с. 49]. Гэта тлумачыцца традыцыяй, згодна з якой сярод дадзенага тыпа «*знаючых*» жанчыны маглі займацца знахарскай практыкай толькі пасля менапаузы: «*Шаптаць луччэ ўсіго, када бабкой ужэ станеш, када бабкой станеш*» [К.Я.І.].

Да назваў, якія характарызуюць функцыянальны бок дзейнасці дадзенага тыпу носьбітаў знахарскіх ведаў, а менавіта спецыялізацыю, адносіцца «*павітуха*». Павітуха на тэрыторыі Беларускага Палесся неабавязкова адносілася да «*знаючых*», аднак на практыцы большасць з іх адначасова былі «*шаптухамі*» [13, с. 47, 51-52]. Гэта тлумачыцца характарам іх дзейнасці. На працягу ўсяго радавога перыяду павітухамі выконвалася значная колькасць магічных абрадаў ахоўнага і лячэбнага характару. Таму на гэтую ролю стараліся выбіраць менавіта «*шаптух*», дасведчаных у дадзеным пытанні. Пацверджаннем іх ідэнтычнасці з'яўляюцца аднолькавыя полаўзроставыя абмежаванні: звычайна гэта былі жынчыны, якія выйшлі з рэпрадукцыйнага ўзросту, што адпаведна выражалася ў аднолькавай назве для «*шаптух*» і «*павітух*» – «*баба*». Праўда, яшчэ ў канцы XIX – пачатку XX ст. дадзеная функцыя «шаптух» пачынае паступова адыходзіць. Аднак, як паказваюць палявыя даследаванні аўтара, шэраг «*шаптух*» да нашага часу захоўвае магічныя веды, неабходныя для выканання дадзенага віду дзейнасці, якія ў апошнія дзесяцігоддзі носяць пераважна пасіўны характар.

Крыніцай магічных ведаў другога тыпу «*знаючых*» – «*знахароў*» на тэрыторыі Беларускага Палесся традыцыйна лічылася нячыстая сіла. «Прымхлівы народ цвёрда перакананы, што знахары маюць адносіны з нячыстымі духамі, якія ўсё кажуць ім, і гэта падцвярджаюць фактычна» [14, с. 259]. Дадзеная сувязь, згодна традыцыйным уяўленням на тэрыторыі Беларускага Палесся, давала такім людзям значныя звышнатуральныя здольнасці, якія маглі выкарыстоўвацца як у станоўчым, так і ў адмоўным накірунках у адносінах да людзей, сельскай гаспадаркі і г.д., што выражалася ў антонімах накшталт: «*зачараваць*» – «*адчараваць*», «*зрабіць*» («*прырабіць*») – «*адрабіць*»: «*Знахоры от казалы ў нас, на Бусы была такая Тэкля знахірка, от тая могла нешо зробыты і одробыты*» [О.А.П.]. Другой асноўнай функцыяй з'яўлялася варажба. На даследуемай тэрыторыі побач з назвай «*знахар*» існавалі і іншыя назвы дадзенага тыпу носьбітаў знахарскіх ведаў: «*вядзьмар*» (ж. «*ведзьма*»), «*чараўнік*» (ж. «*чараўніца*»), «*чарнакніжнік*» (ж. «*чарнакніжніца*») а таксама «*варажбіт*" («*варажбітка*», «*варожка*»), якія выражалі пэўную ацэнку дзейнасці дадзенага тыпу «*знаючых*», а таксама спецыялізацыю ў дзейнасці. Межы іх прымяненне не былі дакладна акрэслены. Тым не менш назіраюцца наступныя заканамернасці іх выкарыстання.

Слова «*знахар*» мела нейтральна-станоўчую афарбоўку і абазначала «*знаючага*», дзейнасць якога была скіраваная пераважна на дапамогу людзям ці не была скіраваная ім на шкоду. Так, Ч.Г. Пяткевіч прыводзіць наступнае выказванне інфарманта аб вядомым у Рэчыцкім павеце «*знахары*» па мянушцы Атаман Мірон: «Ось, недалека шукаючы, калісь атаман Мірон быў вялікі знахар, хаць і вялікі грэшнік, бо быў чараўніком, Господзі яму прасьці на том сьвеці. [...] Затым то ён быў багаты, да, знаючы ўсё добрае і ліхое, зла нікому не чыніў, як робяць другія чараўнікі за чарку або за



ПолесГУ

грошы; яго яшчэ звалі адрабляць усялякае чартавінне» [15, с. 487-488]; ці: «Знахар. Гэты чалавек, маючы адносіны з нячыстай сілаю, займаецца, збольшага, лячэннем хвароб і ў выключных выпадках шкодзіць» [16, с. 190]; ці: «Кожны знахар то ёсць так добро як вядзьмар, бо кожны з чортам знаецца, але не ва ўсякага з іх злапамятнае серца, то людзям памагае» [11, с. 101].

У адрозненні ад «*знахара*» словы «*вядзьмар*» (ж. «*ведзьма*» «*вядзьмарка*»), «*чараўнік*» (ж. «*чараўніца*»), «*чарнакніжнік*» (ж. «*чарнакніжніца*») маюць адмоўнае адценне і абазначаюць носьбітаў знахарскіх ведаў, дзейнасць якіх мела адмоўны накірунак: «Ведзьмары, ведзьмы да чараддзейнікі робляць усялякія рэчы, гамоняць загаворы й такім чынам зачароўваюць людзей, гаўядо да ўсялякае жыўёло, расліну й нават могуць так зачараваць, што стрэлба не страляе. або жывінь. ці што-небудзь іншае» [10, с. 264]. Пры гэтым слова «*ведзьма*» (у меньшай ступені «*вядзьмар*») абазначала носьбітаў знахарскіх ведаў дадзенага тыпу, чыя дзейнасць пераважна была прымеркаваная да пэўных храналагічных адрэзкаў часу (пераважна каляндарных святаў, такіх як Юр'е (23.04 ст.ст./06.05 н.ст.), Купала (23.06 ст.ст./06.07. н.с.), і накіраваная на прычыненне шкоды шляхам «адбірання» малака ў кароў, а таксама ўраджаю і прычынення шкоды гаспадарцы праз завіванне «*завітак*». «Як у ноч на Купалу ведзьмы адбіраюць малако ў кароў, так і ў Троіцкую ноч ведзьмакі адбіраюць ураджай з ніў» [7, с. 37-38; 17, с. 82]. Пры гэтым характар дзейнасці «*ведзьмы*» лічыўся таямнічым, без дэманстрацыі свайго статусу іншым. Таму, нягледзячы на вялізную колькасць былічак і апавяданняў аб іх, рэальная колькасць выпадкаў, калі людзей заставалі за гэтымі заняткамі, з'яўлялася значна меншай. Як адзначае В.Ф. Райан, «уяўляецца, што ведзьма значна часцей прысутнічае ў фальклоры і народных вершах, чым у рэальным жыцці» [5, с. 130]. Часцей за ўсё абвінавачванні падалі на людзей, якія нават не займаліся знахарствам. Так, карэспандэнт Е.Р. Раманава адзначае аб сялянах Гродзенскай губерніі: «Таму чараўнікоў і ведзьмароў сяляне баяцца і ставяцца да іх з пагардай; няма большай крыўды для сялянкі, калі хто назаве яе ведзьмаю; тады яна галосіць і гаворыць на споведзі свайму духоўнаму айцу, што яе называюць ведзьмай, хоць яна нічога вядзьмарскага не разумее» [17, с. 46].

Трэба яшчэ раз адзначыць, што сэнс дадзеных слоў і тыя адценні, якія яны выражалі згодна з крыніцамі, не былі абсалютнымі. Так, калі інфарманты Ч.Г. Пяткевіча з Рэчыцкага павета шырока выкарыстоўваюць побач са словам «*знахар*» слова «*чараўнік*», то інфармантка з Драгічынскага раёна адзначае: «Звалы – знахорка, знахор. А «чаровнык», «чаровныця» – мало звалы, гэто можэ дэ с кніжок чы з пісень. А «відьма» – бабсько дэ якое, тое самэ, шо знахорка» [18, с. 364]; ці: «*Бувалі, бувалі такія дзяды, шо знімалі. У нас не называлі чарнакніжнікі. Так знахары. У нас тока казалі ведзьмары, да й ўсё. Ведзьмары*» [А.А.У.]. З іншага боку дадзеная неакрэсленасць тлумачылася таксама канкрэтным напаўненнем, якое ўкладвалася ў дадзеныя словы ў залежнасці ад канкрэтнай сітуацыі і прымяняльна да канкрэтнага чалавека. Патэнцыйна кожны «*знаючы*» дадзенага тыпу мог дзейнічаць у станоўным ці ў адмоўным накірунку, пры гэтым для яго характарыстыкі насельніцтвам маглі выкарыстоўвацца розныя назвы ў залежнасці ад пэўнай сітуацыі. Так, напрыклад, А.К. Сержпутоўскі прыводзіць звесткі аб некім «*ведзьмаку*» з в. Чудзін Слуцкага павета, якога звалі Іван Санюк, па прозьвішчу Порцаю, які распавёў даследчыку аб розных спосабах завівання «*завітак*» з мэтай пашкодзіць гаспадарцы і людзям. Далей аўтар паведамляе: «Іван Порца ведае яшчэ шмат розных замоў на ўсялякія выпадкі жыцця, але запісаць іх у мяне не атрымалася, бо падчас майго знаходжання ў в. Чудзін Івана Порцу павезлі ў суседні Мазырскі павет для лячэння хворых» [19, с. 34-35]; ці: «*Нэ помітаю того діда, шо ўсэ казалы, шо він ето знахор і знахоруе. Шо він дзесь одробляе, прымерно як от тобе дэсь нішо яка бэда, то одробляе, знахоруе, і знахоруе каб тобі шо плохо було. Ну на кого злы то він вжэ знахоруе, шоб йому було ўжэ шо-то плохо, а хто да яго добрэ, то ён ўжэ знахоруе, каб ўжэ выйшло ўсэ було добрэ*» [Б.Л.К.]. Сярод іншых фактараў можна адзначыць і просты страх большасці насельніцтва дрэнна адзывацца аб такіх людзях па прычыне меркаванай помсты з іх боку. Так, М.В. Доўнар-Запольскі адзначае, што «*знаючых*» дадзенага тыпу «баяцца называць ведзьмаком ці ведзьмай не толькі ў вочы, але і за вачыма, паколькі вераць, што яны могуць даведацца і, канешне ж, пашкодзяць смельчаку» [20, с. 2].

Яшчэ адной назвай другога тыпу «*знаючых*» людзей на тэрыторыі Беларускага Палесся, якая характарызавала спецыялізацыю ў адной з асноўных функцый «*знахараў*» – варажбе, з'яўлялася адпаведна назва «*варажбіт*» (ж. «*варажбітка*», «*варожка*»). Яе шырокае бытаванне можна растлумачыць важнасцю дадзенага віду дзейнасці «*знахараў*» для насельніцтва: «Ныхто нычого нэ зробіть бэз знахора, ведзьмуў, знахориў» [21, с. 123]. Важнасць варажбы дадзенага тыпу знаючых выступала не толькі існаваннем яе як асобнай практыкі. Варажба з'яўлялася непасрэднай часткай большаці абрадаў, якія праводзіліся «*знахарамі*». Напрыклад, вырываючы «*завітку*», спачатку не-



Полесгу

абходна было даведацца, хто яе зрабіў, перад тым як непасрэдна прыступаць да дзеянняў. Гэтыя здольнасці, як казалася вышэй, на думку насельніцтва, дасягаліся праз сувязь з нячыстай сілай, таму меркавалася, што кожны «*знахар*» можа варажыць. Гэта падцвярджаецца і матэрыяламі палявых даследаванняў. Так, у Лельчыцкім раёне яшчэ зараз памятаюць так званую «*Саламяную бабу*», аб якой піша ў першай трэці 1920-х гг. С. Шаўковіч: «Наогул шаптухам, гадальшчыцам вельмі вераць. На хутары Сярэднія Печы жыве «Саломенная баба». Яна гадае на саломе, і да яе шмат прыпрыходзіць народу за дзесяткі вёрст» [22, с. 44]. Пры гэтым інфармантамі аўтара адзначаецца, што «Саламяная баба» не толькі варажыла: *«У нас у дзярэўні было й баба-ворожка ворожыла і на солому гадала, і ворожыла, і воду давала* (г.зн. лячыла – аўт.)» [Ф.В.І].

У кантэксце даследуемай тэмы неабходна закрануць таксама існуючы ў літаратуры тэрмін «прафесійнае чараўніцтва», які ўпершыню выкарыстоўвае А.Я. Багдановіч у сваёй працы [23, с. 134]. Услед за ім у некаторых працах «прафесійныя чараўнікі» выдзяляюцца ў самастойны тып «*знаючых*». Між тым А.Я. Багдановіч меў на ўвазе тое, што прадстаўнікі пэўных заняткаў павінны валодаць знахарскімі ведамі для паспяховасці сваёй дзейнасці. Надзяленне звышнатуральнымі здольнасцямі прадстаўнікоў пэўных прафесій і заняткаў: млынара, пастуха, пчаляра, каваля, старца, музыкі і многіх іншых [7, с. 437-477] ва ўсходніх славян (і не толькі іх) добра даследавана і звязана з уяўленнямі, характэрнымі для сялянскіх супольстваў, аб валоданні магічнымі ведамі людзьмі, якія нечым адрозніваліся ад «сярэднестатыстычнага» чалавека. Так, П.В. Шэйн адзначае: «багачы між сялянамі […] карыстаюцца ў сваім асяроддзі дурной рэпутацыяй; іх лічаць валшэбнікамі, чарадзеямі, прадаўшымі сваю душу нячыстай сіле. […]. Беднякі ж з сялян думаюць, што яны ад таго бедныя, што не могуць абараніць сябе ад шкоды, нанасімай нячыстай сілай» [14, с. 306]. Па прычыне характара сваіх ведаў, а менавіта праз сувязь з нячыстай сілай такія людзі адносіліся да тыпу «*знахараў*», адпаведна пры гэтым яны маглі выконваць і іншыя функцыі, характэрныя для дадзенага тыпу «*знаючых*». Крыніцы прама ўказваюць на гэта: «Адзін млынар ведаў, як можна камень ўсцягнуць на млын. […] А быў тут іншы млынар, які ніяк не мог ўсцягнуць камень у свой млын, што ні рабіў. Паклікаў тады гэтага знахара, даў тры рублі, напаіў гарэлкай, і не прайшло й гадзіны, як ён падняў жэрнаў на вятраны млын. А гэта ўсё ад таго, што ён ужо знае. Мяркуецца, што ўдачлівы млынар знаецца з нячыстай сілай» [17, с. 75]. Такім чынам, выдзяляць «прафесійнае чараўніцтва» як асобны тып знаючых безпадстаўна.

Так выглядала традыцыйная тыпалогія носьбітаў знахарскіх ведаў на тэрыторыі Беларускага Палесся ў канцы XIX – першай трэці XX ст. У пазнейшы час у разглядаемым пытані адбыліся значныя змены. Яны былі выкліканы імклівымі сацыяльна-эканамічнымі і культурна-духоўнымі зменамі ў жыцці насельніцтва дадзенага рэгіёну: калектывізацыяй, індустрыялізацыяй, урбанізацыяй насельніцтва, станаўленнем сеткі медыцынскіх, адукацыйных і культурных усноў, наступствам чаго з'яўлялася распаўсюджванне матэрыялістычнага светапогляду. Дадзеныя працэсы выклікалі значныя зменыў ў знахарстве, у тым ліку і ў тыпалогіі «*знаючых*». Перш за ўсё адбываюцца змены сярод саміх тыпаў носьбітаў знахарскіх ведаў. Напрацягу XX ст. практычна поўнасцю знікае другі тып «*знаючых*» – «*знахары*», паколькі іх асноўныя функцыі ў выніку вышэйадзначаных працэсаў страцілі сваю актуальнасць. Да гэтага можна дадаць праследаванне носьбітаў знахарскіх ведаў, перш за ўсё «*знахараў*», з боку афіцыйных улад, аж да крымінальнай адказнасці. Усё гэта значна знізіла статус дадзенага тыпу «*знаючых*» і зрабіла занятак знахарствам малапрэстыжным. Напачатку XXI ст. інфарманты адзначаюць знікненне такіх людзей: «А хто такія знахары? – *У нас тута не маека. Булы, ўжэ паўміралі. Ну воны тожа отроблялі людзям, узнавалі, колішнія людзі*» [Д.М.І.]. Пры гэтым змянілася стаўленне да дадзенага тыпу «*знаючых*». У канцы XIX – першай трэці XX ст., як было паказана вышэй, асуджалася толькі негатыўная дзейнасць «*знахараў*», а сама наяўнасць магічных ведаў, нават праз сувязь з нячыстай сілай, не лічылася адмоўнай. На працягу XX ст. адбываецца матэрыялізацыя і дуалізацыя светапогляду насельніцтва, вынікам чаго стала негатыўнае стаўленне да «*знахараў*» менавіта праз іх мяркуемую сувязь з нячыстай сілай. Падчас палявых даследаванняў аўтара частка апытваемых інфармантак адмаўлялася расказваць нават шырока бытаваўшыя раней прысушкі, бо гэта, на іх думку, грэшна. Па аналагічнай прычыне многія зараз негатыўна ставяцца да варажбы: «*Я будушчэ нэ хочу, нэ хочу й мутыты, нэ хочу й казаты*» [Б.А.С.]. Вынікам гэтага стала нежаданне моладзі ўспрымаць веды дадзенага тыпу «*знаючых*». Пры гэтым самі «*знахары*» часта адмаўляліся перадаваць свае веды, нават нягледзячы на просьбы. Напрыклад, адна з нямногіх сустрэтых намі «*знахарак*» распавяла аўтару, што не жадае перадаваць свае веды ўнуку, нягледзячы на яго жаданне. «*У мяне унучак от такі высокі, здаровы, ка: «Баба, ты ж мне перадасі»? Я ку: «Нікаму. Не хачу*»« [В.Е.А.]. Наогул, апытаныя намі «*шаптухі*» катэгарычна адмаўляюць наяўнасць усялякіх кантактаў з нячыстай



ПолесГУ

сілай: «*Я не знаю, тыя знахары, ета ж яны етаго во… Есць такі шо кажуць, шо прыробляюць, а тыя одробляюць. Я етаго нічога не знаю. Я ім і не веру. Я знаю шо я шапчу од Бога, по Божаму, а тэ знахарство ўжэ, то оно мо ўжэ…*» [М.А.І.]. Сярод насельніцтва Беларускага Палесся, асабліва сярод маладых людзей, шырока распаўсюдзіліся погляды на тыпы «*знаючых*» у межах дуалістычнага падыхода «знахар – чараўнік», чаму ў значнай ступені садзейнічаюць СМІ і медыя (асабліва тэлебачанне). Як вынік, распаўсюдзіліся і новыя назвы, якія характарызуюць тыпы носьбітаў знахарскіх ведаў. Напрыклад, слова «калдун», якое ў пачатку XX ст. практычна не згадваецца ў крыніцах, аднак ужо ў канцы 1920-х гг. пачынае сустракацца побач з традыцыйнымі назвамі [10]. Распаўсюджванню новых назваў садзейнічала таксама пашырэнне міжэтнічных кантактаў у XX ст. З іншага боку, некаторыя назвы «*знаючых*» больш не ўжываюцца. У прыватнасці, гэта тычыцца «*павітухі*», па прычыне знікнення дадзенай спецыялізацыі. Сучаснае знахарства Беларускага Палесся у канцы XX – пачатку XXI ст. прадстаўлена амаль выключна першым тыпам «*знаючых*» – «*шаптунамі*», якія захавалі частку сваіх функцый. Пражываюць яны пераважна ў сельскай мясцовасці, а таксама невялікіх гарадах. Большасць з іх з'яўляюцца жанчынамі ў сталым узросце. Інфармантамі адзначаецца, што саміх «*знаючых*» стала меней у параўнанні з мінулымі часамі: «*Да. Раньшэ большэ. Цяпер йе, но цяпер маладыя большэ к этаму не стрэмяцца. А раньшэ, вот як я знаю, ў свае годы малыя як я была, очэнь многа. У нас ў дзярэўні було мо восем бабак такіх. Шо якая дзеравушка небальшая была*» [А.Г.У.]. Аднак Беларускае Палессе лічыцца сярод насельніцтва суседніх рэгіёнаў тэрыторыяй, дзе да нашага часу захавалася шмат носьбітаў знахарскіх ведаў: «*Гэтыя вось Міхалёўцы* (перасяленцы пасля аварыі на ЧАЭС з в. Міхалёўка Брагінскага)… *многа сярод іх етых шаптуноў*» [С.Н.А.].

Такім чынам, на тэрыторыі Беларускага Палесся традыцыйна існавалі два асноўныя тыпы носьбітаў знахарскіх ведаў: «*шаптуны*» і «*знахары*», якія адрозніваліся паміж сабой крыніцамі паходжання магічнай сілы і функцыямі (у адрозненні ад канцэпцыі «знахар – чараўнік», дзе розніца палягае не ў функцыях, а ў накіраванасці практыкі). Пры гэтым іншыя назвы, якія ўжываліся для характарыстыкі носьбітаў знахарскіх ведаў, не з'яўляліся абазначэннямі нейкіх іншых, прынцыпова адрозных тыпаў «*знаючых*», а з'яўляліся ўдакладняльнымі характарыстыкамі двух асноўных тыпаў. Дадзены падыход у тыпалогіі «*знаючых*» дазваляе пазбегнуць блытаніны і карэктна інтэрпрэтаваць этнаграфічныя матэрыялы. Ён таксама прыгодны для апісання знахарства іншых гісторыка-культурных рэгіёнаў у беларусаў, аб чым сведчаць адпаведныя матэрыялы. Пры гэтым неабходна ўлічваць змены сярод тыпаў «*знаючых*» напрацягу XX ст., якія заключаюцца ў знікненні аднаго з асноўных тыпаў носьбітаў знахарскіх ведаў – «*знахароў*», а таксама змяненні стаўленння насельніцтва да дадзенага тыпу носьбітаў знахарскіх ведаў, што, у сваю чаргу, патрабуе крытычнага падыходу пры аналізе сучасных матэрыялаў па дадзенай тэме.

## ЛІТАРАТУРА

1. Ненадавец, А.М. Сілаю слова. Чорная і белая магія / А.М. Ненадавец. – Мінск : «Выдавецтва Беларусь», 2002. –351 с.

2. Барташэвіч, Г.А. Знахарства / Г.А. Барташэвіч // Беларускі фальклор: Энцыклапедыя : у 2 т. / Рэдкал.: Г.П. Пашкоў [і інш.] – Мінск : БелЭн, 2005. – Т.1: Акапэла – Куцця. – С. 547.

3. Романов, Е.Р. Белорусский сборник. Вып. V. Заговоры, апокрифы, духовные стихи / Е.Р. Романов. – Витебск: Типолитография Г.А. Малкина, 1891. – 450 с.

4. Замовы / Уклад., сістэм. тэкстаў, уступ. арт. і камент. Г.А. Барташэвіч; рэдкал.: А.С. Фядосік (гал. рэд.) [і інш.] – Мінск : Беларуская навука, 2000. – 597 с.

5. Райан, В.Ф. Баня в полночь: исторический обзор магии и гаданий в России / В.Ф. Райан; пер. с англ. – М.: Новое литературное обозрение, 2006. – 720 с.

6. Торен, М.Д. Русская народная медицина и психотерапия / М.Д. Торен. – СПб.: Литера, 1996. – 496 с.

7. Народная демонология Полесья: Публикации текстов в записях 80-90-х гг. XX века / Сост. Л.Н. Виноградова, ЕЕ. Левкиевская. – М.: Языки славянских культур, 2010. – Т.1 : Люди со сверхъестественными свойствами. – 648 с.

8. Мазуркевіч, Л.М. Лексіка народнай медыцыны Усходняга Палесся : дыс. … канд. філал. навук. / Л.М. Мазуркевіч. – Мазыр, 2002. – 149 с.

9. Чалавек: тэмат. слоўн. / Нац. акад. навук Беларусі / Ін-т мовазнаўства імя Я. Коласа; склад. В.Дз. Астрэйка [і інш.]; навук. рэд. А.П. Кунцэвіч, А.А. Крывіцкі. – Мінск : Бел. навука, 2006. – Ч.-16. – 573 с.

10. Сержпутоўскі, А.К. Прымхі і забабоны беларусаў-палешукоў / А.К. Сержпутоўскі; прадм. У.К. Касько ; Мастак В.Р. Мішчанка. – Мінск : Універсітэцкае, 1998. – 301 с.

ПолесГУ

11. Lud bialoruski na Rusi Litewskiej / przez Michala Federowskiego. – Krakow: Wydawnictwo komisyi antropologiczney Akademii umiejęntności w Krakowie, 1897. – T. 1: Wiara, wierzenia: przesądy ludu z okolic Wolkowyska, Slonima i Sokólki. – 509 s.
12. Жук, У. Санітарна-бытавы стан вёскі Дуброва, Лельчыцкага сельсавету Мазырскае акругі / У. Жук, П. Панкоў // Наш край. – 1929. – №2. – С. 43-49.
13. Сицинский, А.А. Акушерская помощь в Минской губернии (1880-1889) / А.А. Сицинский. – СПб : Типография П.П. Сойкина, 1893. – 217 с.
14. Шейн, П.В. Материалы для изучения быта и языка русскаго населения Северо-Западного края / П.В. Шейн – СПб.: Типография имп. Академии Наук, 1902. – Том III.– 536 с.
15. Пяткевіч, Ч.Г. Рэчыцкае Палессе / Ч.Г. Пяткевіч; уклад., прадм. У. Васілевіча; Пер. з пол. Л. Салавей і У. Васілевіча. – Мінск : Беларускі кнігазбор, 2004. – 672 с.
16. Булгаковский, Д.Г. Пинчуки. Этнографический сборник : песни, загадки, пословицы, обряды, приметы, предрассудки, поверья, суеверья и местный словарь / Д.Г. Булгаковский // Записки Императорского Русского географического общества по отделению этнографии. – Т. XIII. – Вып. 3. – СПб., 1890. – 200 с.
17. Материалы по этнографии Гродненской губернии / Под ред. Е.Р. Романова. –Вильно : Русский почин, 1911 – 238 с. – Вып. 1.
18. Климчук, Ф.Д. Духовная культура Полесского села Симоновичи / Ф.Д. Климчук // Славянский и балканский фольклор. Этнолингвистическое изумение Полесья. – М.: Индрик, 1995 – С. 335 – 380.
19. Сержпутовский, А.К. О завитках в Белоруссии (очерки о жизни крестьян южной полесской части Слуцкого уезда Минской губ.) / А.К. Сержпутовский // Живая старина. – 1907. – Вып. 1. – С. 33 – 38.
20. Довнор-Запольский, М.В. Белорусская свадьба и свадебные песни. Этнографический этюд / М.В. Довнор-Запольский. – Киев : Типография А. Дивиденко. – 38 с.
21. Гура, А.В. Материалы к полесскому этнолингвистическому атласу / А.В. Гура, О.А. Терновская, С.М. Толстая // Полесский этнолингвистический сборник. Материалы и исследования. – М : Наука, 1983. – С. 49-153.
22. Шаўковіч, С. Некаторыя весткі аб Тонескім сельсавеце Тураўскага раёну / С. Шаўковіч // Наш край. – 1929. – №4. – С. 42 – 45.
23. Богданович, А.Е. Пережитки древнего миросозерцания у Белорусов: этнографический очерк / А.Е. Богданович. – Гродно : Губернская типография, 1895. – 189 с.

**Спіс інфармантаў**

К.Ф.М. – Кузьміч Федора Мартынаўна, 1923 г.н., в. Баландзічы Іванаўскага раёна.
С.Е.П. – Сасноўская Ева Паўлаўна, 1938 г.н., г.п. Лельчыцы Лельчыцкага раёна.
К.Я.І. – Кудзінь Ядвіга Іванаўна, 1925 г.н., г.п. Лельчыцы Лельчыцкага раёна.
О.А.П. – Оменчук Аляксандра Паўлаўна, 1935 г.н., в. Моладава Іванаўскага раёна.
А.А.У. – Астаповіч Анастасія Уладзіміраўна, 1931 г.н., вёска Дуброва Лельчыцкага раёна.
Б.Л.К. – Барысюк Лідзія Карпаўна, 1928 г.н., в. Стрэльна Іванаўскага раёна.
Ф.В.І. – Фіцнер Вольга Іосіфаўна, 1929 г.н., в. Грэбені Лельчыцкага раёна.
Д.М.І. – Дзенісовіч Марыя Іванаўна, 1934 г.н., в.Альманы Столінскага раёна.
Б.А.С. – Белаус Антаніна Сямёнаўна, 1940 г.н., в. Чорнава Пінскага раёна.
В.Е.А. – Васкалей Ерына Аляксандраўна, 1941 г.н., в. Чорнава Пінскага раёна.
М.А.І. – Мароз Алена Ігнацьеўна, 1937 г.н., в. Маркоўскае Лельчыцкага раёна.
А.Г.У. – Астаповіч Ганна Уладзіміраўна, 1950 г.н., г.п. Лельчыцы Лельчыцкага раёна.
С.Н.А. – Смалярова Надзея Арцёмаўна, 1937 г., в. Баец Буда-Кашалёўскага раёна.

## THE TYPES «KNOWING» IN BELARUSIAN POLESIE AND THEIR CHANGES IN XX – EARLY XXI CENTURY

***V.A. HANCHAR***

***Summary***

Article is based on published ethnographic materials, and also own field researches of the author. In work are considered types of «witch doctors» in Belarusian Polesie in the XX – beginning XXI century. The author identifies two basic types of witchcraft knowledge carriers in the region: «shaptunow» i «znaharaw», who differed in sources of origin of magical powers and functions. Conclusions about changes in these types of «witch doctors» in the XX – beginning XXI century under the influence of socio-economic and cultural processes that occurred in this region in the XX century.

© Ганчар У.А.
*Поступила в редакцию 12 апреля 2011 г.*

ПолесГУ